# Запалонены песняй зямлі



## Да 130-годдзя з дня нараджэння Змітрака Бядулі

Ужо не адно пакаленне беларускіх школьнікаў далучылася да чароўнага свету творчасці класіка беларускай дзіцячай літаратуры Змітрака Бядулі (Самуіла Яфімавіча Плаўніка), чыё 130-годдзе мы святкуем сёлета (23.04.1886 — 3.11.1941). Творы гэтага таленавітага пісьменніка сталі своеасаблівым люстэркам, з дапамогай якога пазнаецца глыбокі ўнутраны свет чалавека, яго цесная ўзаемасувязь з навакольнай таямнічай прыродай і сацыяльнай рэчаіснасцю.

Змітрок Бядуля нарадзіўся ў беднай, але дружнай і творчай сям'і. Бацькі не мелі тады яшчэ свайго месца жыхарства і жылі ў хаце дзеда па бацькоўскай лініі. У сям'і, нягледзячы на сціплы дастатак, панаваў культ кнігі і музыкі. Дзед быў заўзятым кнігалюбам і адзіным чалавекам у мястэчку Пасадзец, што на Лагойшчыне, які меў сваю бібліятэку. Нават апошнія грошы ён мог аддаць на набыццё цікавай кнігі. А бацька паэта любіў вечарамі іграць на скрыпцы і артыстычна дэкламаваць вершы для сваіх дзяцей і родзічаў.

Маленькі Самуіл шмат часу бавіў з дзедам. Той быў адмысловым майстрам па вырабе меднага посуду і прылад працы для мясцовых жыхароў. Часам унук уяўляў дзеда фантастычнай істотай, якая варожыць каля агню кавальскага горна, ствараючы розныя па форме рэчы з плаўленага металу. Да таго ж ён мог захапляльна расказваць хлопчыку розныя займальныя гісторыі з народных паданняў, кніжак, казак і асабістага жыццёвага вопыту.

Дзякуючы вялікаму аматару кніг і "чараўніку" дзеду ўнук пачаў чытаць яшчэ да школы. У сямігадовым узросце ён стаў наведваць пачатковую яўрэйскую школу — хедар. Бацькі хацелі бачыць свайго сына святаром, таму пазней накіравалі яго на вучобу ў духоўную семінарыю — ешыбот, спачатку ў мястэчка Даўгінава, затым у Іллю. У 15 гадоў юнаку давялося пакінуць вучобу ў ешыбоце, але працэс самаадукацыі адбываўся на працягу ўсяго астатняга жыцця.

Дар паэта, мастака слова ў Змітрака Бядулі прачнуўся вельмі рана. Успамінаючы гады вучобы ў хедары і ешыбоце, пісьменнік казаў, што заўсёды меў жаданне маляваць, слухаць музыку, складаць вершы, але гэтыя яго схільнасці не былі запатрабаваны ў рэлігійных навучальных установах. Там панаваў дух строгага, казённага навучання, з завучваннем рэлігійных малітваў і дагматаў. Аднак стыхія мастацкага слова ўсё больш паглынала ўражлівую натуру юнака. Ён вельмі рана ўсвядоміў, што слова валодае тым гіпнатычным дарам, які дазваляе закрануць душу кожнага чалавека.

Нездарма ў сваім першым апублікаваным на беларускай мове творы-імпрэсіі "Пяюць начлежнікі" (1910) пісьменнік вельмі паэтычна выражае галоўную ідэю, напэўна, усёй сваёй творчасці, выказваючы асабістую тугу, заклапочанасць няшчаснай доляй простага народа і разам з тым надзею, веру ў адраджэнне і лепшае жыццё.

"Якая моцная падмога ідзе ад цябе, шчырая святая песня!.. Нудным і вясёлым часам ты заглядаеш у нашы душы! Ты лечыш наша гора, ты аблягчаеш нашу працу, ты абціраеш кроў і пот, даеш надзею і моц, малюючы шэрае жыццё, цешыш надзеяй на лепшае. Чуе цябе душа наша, і радуецца, і лунае разам з табой да светлага неба... Пяюць начлежнікі..." [1, с. 15].

Змітрок Бядуля, сын шчодра палітай горкім потам і салёнымі слязьмі зямлі, спачуваў і пакутаваў з-за жабрацкага лёсу роднага яму народа. Гаротна-малітвенным настроем прасякнуты зварот сялянкі-падзёншчыцы да сонца ("Не пячы гэтак, сонейка!"), якая жне на панскім полі ад усходу да захаду сонца ў той час, як яе сын-немаўлятка застаўся ў калысцы адзін дома, "з адной сухой усалачкай" [1, с. 18]. Толькі сонцу яна можа пажаліцца на свой цяжкі лёс, бо ў людзей мала спагады да яе — у кожнага свой, можа, не меншы цяжар жыцця. Ад маркотных дум і зацятай працы жняя нават не заўважае, што парэзала сярпом сабе руку і кроў чырванню

афарбавала снапы. “ — Гэта ж ты руку парэзала! — крыкнулі ёй спуджаныя жнеі...” [1, с. 18]. Кроў, якая выцякае з параненай рукі маладой удавы, — сімвал прадчування, што жыццё хутка пакіне гэтую жанчыну. А *спуджанасцю* жней аўтар быццам хоча падкрэсліць, што праца на панскім полі адбываецца пад прымусам, людзей моцна трымае ў сваіх учэпістых кіпцюрах пачуццё страху і паднявольнай падпарадкаванасці.

Як паэт Змітрок Бядуля вылучаецца выразным рамантычна-сімвалічным характарам светабачання. Яго творы характарызуюцца своеасаблівай пластычнасцю. Кожны прадмет і дэталь наваколля могуць набыць свой нечаканы выгляд і рэалізацыю, каб увесці чытача ў стан трапяткой зацікаўленасці і захаплення, уразіць, здзівіць.

Для Бядулі-паэта характэрны паказ цыклічнай формы выяўлення руху свету, дзе ўсё не канчаткова, не мае свайго завяршэння, а існуе як пэўны этап на шляху да большай дасканаласці. У творах Змітрака Бядулі вартасць і прыгажосць той ці іншай карціны жыцця або прыроды набывае высокую ступень гарманічнай праяўленасці, спалучаецца з элементамі духоўна-маральнага характару. Чароўны, ціхі, таямнічы малюнак снегападу, якім любуецца лірычны герой, заварожвае яго душу, напаўняе сэрца пяшчотай і спакоем:

Сняжыначкі-пушыначкі
Ляцелі матылькамі.
Над хмызамі над шызымі
Дыміліся дымкамі.

Зіхцеліся, мігцеліся
У розныя калёры.
Драбнюткія, пякнюткія,
Як зоранькі, як зоры [2, с. 49].

Прыгажосць разам з духоўнай насычанасцю адлюстроўвае ў поўнай меры дасканаласць і гармонію свету: сняжынкі-пушынкі будуюць хаткі-норкі для зайчыкаў, дзе тыя маглі б сагрэцца ў лютыя маразы:

Вушастыя, пушыстыя,
З драцінкамі-вусамі
Вы, зайчыкі-малойчыкі,
У хаткі к нам таксама!

Сняжыначкі-пушыначкі
Спявалі песні-баі:
“Мы хатачкі-палатачкі
Будуем тут у гаі” [2, с. 50].

Цікавым і шмат у чым паказальным для разумення эстэтыка-паэтычнага крэда рамантыка-сімваліста Змітрака Бядулі з’яўляецца яго верш “Вясною”.

У зачынных слупках твора праз прыём паралелізму з дапамогай асацыятыўных тропаў-параўнанняў аўтар стварае карціну неабсяжнай цудадзейнай прасторы, праз якую ідзе пазнанне навакольнага свету і душы чалавека. Вясна — сімвал адраджэння жыцця ў прыродзе, яна нясе ў сабе неўтаймаваную моц, сілу пераўвасаблення і натхнення.

То не снег — то чаромха цвіце:
Падарунак вясны-дабрадзейкі,
То не снег — то бярозка расце,
То не снег — матылёчкаў сямейка,
То не шоўк — гэта рунь пад гарой,
То вясны маладой арнаменты,
То не скарб дарагі над зямлёй —
То праменняў блішчаць дыяменты [2, с. 46].

Асаблівасць паэтычнай інтуіцыі аўтара, энергія яго слова-сімвала, што ўбірае ў сваю гукавую абалонку ўсю разнастайнасць і мнагазначнасць семантычнага адцення, раскрывае патаемны сэнс кожнай з’явы прыроды:

Мая радасць імчыць да нябёс,
Да бязмежных у далі паветак,
І раблюся я братам бяроз,
Ручаёў, матылькоў, кволых кветак [2, с. 46].

Створаныя паэтычныя вобразы дазваляюць лірычнаму герою ўмоўна пераўвасабляцца ў любую рэч свету, найбольш поўна адчуваць яе межы, будову і ўнутраную сутнасць, што прымушае чытача свядома і адкрыта адгукацца на самы нязначны, непрыкметны рух, гук і колер той ці іншай з’явы.

Запалонен я песняй зямлі,
Загубіўся я ў ёй, як пясчынка.
Не магу ад яе адысці,
Як ад дуба малая галінка [2, с. 46].

Разнастайнасць узаемаадносін ва ўсіх сферах прыроднага і чалавечага свету, ад самых малых да грандыёзных яе праяў, праламляецца праз душу паэта. Аўтар паказвае таямнічы працэс пераўтварэння свету на новы, гарманічны лад, дзе сам чалавек ужо не яго пясчынка, а цэнтр, ядро, “дрэва жыцця” светабудовы.

Вось чаму, на нашу думку, другім сваім паэтычным псеўданімам Самуіл Яфімавіч Плаўнік абраў Ясакар, чорную таполю. Адна з важных асаблівасцей гэтага дрэва — яго магутная каранёвая сістэма. Менавіта таму ясакар часта выкарыстоўваецца для ўмацавання берагоў рэк і ручулак. Змітрок Бядуля-Ясакар бачыў прызначэнне сваёй творчасці ў адлюстраванні ўсёй рэальнасці і складанасці сялянскага быту, выражэнні дум, мар народа пра лепшую будучыню.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Бядуля, З. Спатканне : абразкі, мініяцюры, апавяданні / З. Бядуля. — Мінск, 2007. — 206 с. — (Бібліятэка школьніка).
2. Бядуля, З. Выбраныя творы / З. Бядуля. — Мінск, 2006. — 496 с.

**І. М. ШАЛАДОНАЎ,**
ст. навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.